**Л. В. Жураўская, В. Я. Барысенка** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

# МІКРАТАПОНІМЫ ВЁСКІ ВЕРБАВІЧЫ (структурна-семантычны аналіз)

Вёска Вербавічы, дзе запісаны пададзеныя ніжэй мікратапонімы, знаходзіцца ў Нараўлянскім раёне Гомельскай вобласці за 10 кіламетраў на поўдзень ад райцэнтра *Нароўля* на правым беразе ракі *Мытва*, прытоку *Прыпяці*.

Этымалогія айконіма *Вербавічы* не ўстаноўлена. Магчыма, назва гэта паходзіць ад апелятыва *вярба*, паколькі шлях ад Нароўлі да Вербавіч быў абсаджаны вербамі. Паводле сведчання жыхароў, назва магла ўтварыцца і

МГПУ им. И.П. Шамякина

ад прозвішча *Вербавіч*, пана, якому належала ўладанне, або ад прозвішча Вярба, пачынальніка роду вярбовічаў, яго нашчадкаў [4, с. 73].

Вёска – старажытнае паселішча, заснавана ў 1223 годзе, зараз займае плошчу 10 км², да аварыі на ЧАЭС у ёй налічвалася 600 двароў, цэнтр калгаса “Кастрычнік”. Падзяляецца на асобныя часткі, кожная з якіх мае сваю назву: *Бабчыны, Бор, Буглакі , Варашылаўка, Вербавічы, Забягайлаўка, Закладніцы, Калінаўка, Канец , Кулагі, Меляхі , Нядзеічы, Хутар.* Гэты падзел – вынік паступовага засялення. Назвы маюць у сваёй аснове апелятывы і антрапонімы. Так, апелятывы ўказваюць на месца засялення: *Бор, Канец, Забягайлаўка* (невялічкая вуліца ў баку ад асноўных вуліц), *Хутар.* У аснове астатніх назваў – прозвішчы тых, хто засяліў мясціну: *Бабчыны – Бабчын, Калінаўка – Калінаў, Кулагі – Кулага, Меляхі – Мелех, Нядзеічы – Нядзеіч, Буглакі – Буглак, Варашылаўка – Варашылаў, Вербавічы (Вербікі* [4, с. 73]) *– Вербіч.* Як паказвае матэрыял, назвы частак вёскі падзяляюцца на дзве групы:

1. Мікратапонімы-назоўнікі ў форме множнага ліку, утвораныя ад прозвішчаў з суфіксамі – ***ын (-ін):*** *Бабчын;* ***-іч:*** *Вербавіч, Нядзеіч;* ад бязафіксных уласных імёнаў: *Буглак, Мелех, Кулага,* шляхам далучэння тапанімічнай флексіі ***-і (-ы),*** якая ўказвае на значную колькасць жыхароў з такімі прозвішчамі як нашчадкаў заснавальнікаў мясціны. Мікратапонім *Закладніцы* ўтвораны суфіксальным спосабам (суф. *-ніц-*) ад дзеяслоўнай асновы *закладаць* (пачынаць забудову), флексія *-ы* таксама ўказвае на тое, што тут жывуць нашчадкі заснавальнікаў.

2. Мікратапонімы-назоўнікі, утвораныя ад прозвішчаў з суфіксам ***-аў*** (*Калінаў, Варашылаў*) шляхам далучэння суфікса ***-к*:** *Калінаўка, Варашылаўка.*

Што да мікратапонімаў наваколля вёскі Вербавічы, то гэта назоўнікі пераважна апелятыўнага паходжання. Усяго іх сабрана намі 60 найменняў, з якіх апелятыўнае паходжанне маюць 52, і толькі 8 утвораны ад антрапонімаў.

Паводле структуры мікратапанімічныя назвы падзяляюцца намі на невытворныя і вытворныя (да апошніх мы адносім і састаўныя найменні).

Мікратапонімы апелятыўнага паходжання паводле семантыкі можна падзяліць на наступныя групы:

а) найменні, якія ўказваюць на характар мясцовага рэльефу: *Боўгар* – поле на месцы выгаралага лесу (ад поўгар); *Баравец* – назва поля, дзе раней быў бор (сасновы лес); *Валока* – заліўная доўгая мясціна, летам пакос, можна пасці скаціну; *Глеёк* – урочышча, дзе ёсць грузкія глiністыя мясціны, вясной доўга стаіць вада; *Града* – высокае месца сярод балота, якое можна засяваць; *Гразя* – нізкая мясціна, дзе заўсёды ёсць гразь, вада, вясной непраходнае месца; *Ніўе* – сенажаць, давала добры ўкос; *Пагон* – пясчаная, неўрадлівая глеба, месца для прагону скаціны на пашу і з пашы; *Пагної* – поле паміж Калінаўкай і Нядзеічамі з беднай пясчанай глебай,

МГПУ им. И.П.Шамякина

якая патрабуе ўнясення штогод гною; *Пяшчанка* – узвышанае пясчанае поле, малаўрадлівае, на мяжы вёсак Вербавічы і Дворышча; *Хвалавіца* – добрае ўрадлівае поле, за якое людзі хваляць яго; *Хвойнік* – насаджаны сасновы лес для затрымкі руху пяску на вёску (Нядзеічы);

б) найменні, якія ўказваюць на форму аб’екта, яго памер: *Доўгія Палосы* – палоса – надзельная зямля, перададзеная ў спадчыну ад бацькі дзецям; *Густое* – лес, надта густы, паміж в. Вербавічы і в. Антонаў; *Ніўка* – невялікае поле, якое раней было хутарам, дае добры ўраджай (ураджайнае поле); *Ражок* – невялікі ўчастак зямлі ў форме кліна, выкарыстоўваецца як паша за Нядзеічамі; *Рожкі* – ворнае поле ў форме кліна (раней ўкліньвалася ў лес, хмызняк);

в) мікратапонімы як назвы-арыенціры ўказваюць на месца аб’екта: *Загатка* – поле за Гаткай (гаць – насып для пераходу праз забалочанае месца); *Заброддзе* – поле за бродам; *Замосце* – поле за мастом, узвышанае, на левым беразе р. Мытва (каля Нядзеіч); *Перавессе (Перавесье)* – балота, якое знаходзіцца паміж вёскамі (ад агульнаўсходнеславянскага *весь* “вёска”) Вербавічы і Смалегаўская Рудня. Часцей гэта састаўныя назвы: *Поле за Берэзнікам, Поле за Валокаю, Поле ля Цагельні, Поле за Садом, За Гразямі, Поле ля Канавы* (мясцовая назва р. Мытва), *Поле за Канаваю, Пад Ступішчамі* (паша), *За Рэчкаю* (сенакос), утвораны спосабам прыназоўнікавага кіравання (прыназоўнікі *за, ля, пад*);

г) мікратапонімы, якія ўказваюць на наяўнасць таго ці іншага аб’екта ў мінулым, на ранейшыя вытворчыя працэсы: *Будзішча* – зараз сенажаць, раней забалочаная зарослая дрэвамі мясціна, дзе былі буды (збудаванні), у якіх жылі буднікі, што выпальвалі поташ, смалу, выраблялі дзёгаць; *Бярвішча* – высокая мясціна, перад якой раней было непраходнае балота, праз якое былі пракладзены (бервы – драўляны мост), каб трапіць на гару; *Буслянка* – цяпер поле, на якім раней было балота, калі балота высахла, то ўсё роўна там было шмат буслоў; *Варацец* – поле, на месцы якога раней быў лес, магчыма, ад слова *ворат* (грузапад’ёмнік), спецыяльнае прыстасаванне для карчавання і транспарціроўкі бярвення; *Гатка* – цяпер поле, раней была *гаць* (земляны насып) для праходу праз балота; *Журжава* – цяпер поле на больш высокіх мясцінах, паша – на нізкіх, раней выраблялася жалеза з жалезнай руды; *Луцішча* – цяпер поле, раней былі ліпавыя лясы, дзе здабывалі *лут* (кару маладых ліп); *Мечына* – цяпер поле, раней мяжа (*мета*), паміж землямі, якія належалі розным гаспадарам; *Палянка* – поле сярод былога лесу; *Пелі* – поле, неўрадлівае, на якім раней капалі гліну, ямы (*пелі*) засталіся; *Печкі* – поле, на якім раней была вытворчасць смалы ў печах; *Пень* – поле, на якім пасля вырубкі лесу засталіся пні; *Ступішча* – паша, поле, раней забалочанае месца, па якім можна было прайсці сцежачкай, ступаючы (ад мясц. *Ступа* – непрыкметная сцежка);

МГПУ им. И.П.Шамякина

д) на здарэнні, якія маглі мець (мелі) месца, указваюць мікратапонімы: *Курганне* – узвышша, поле, вакол якога раней было балота. Паводле мясцовага падання, гэта было месца пахавання, адсюль курган; *Смерцьдаліна (Смердаліна)* – раней месца ў лесе, дзе хаваліся людзі ад мангола-татараў, ад смерці, цяпер балацявіна, паша; *Сельская гара* – пясчанае ўзвышша, паводле мясцовага падання, гэта было першае пасяленне [4, с. 73].

Амаль усе сабраныя мікратапонімы вытворныя. Яны складаюць каля 85 % ад агульнай колькасці мікратапонімаў (усяго сабрана 72 мікратапонімы апелятыўнага і антрапанімічнага паходжання).

Сярод невытворных мікратапонімаў апелятыўнага паходжання вылучаем наступныя: *Бор, Канец, Гразя, Хутар, Цемра, Пелі, Града, Валока, Пень.*

Вытворныя адапелятыўныя мікратапонімы ўтварыліся пры дапамозе суфіксаў:

***-к-:*** *Печкі, Палянка, Рожкі, Гатка;* ***-ішч-:*** *Будзішча, Бярвішча, Ступішча, Луцішча,* найменні маюць
форму множнага ліку: *у Будзішчах, на Бярвішчах, у Ступішчах, Луцішчах;*

***-янк-:*** *Буслянка;* ***-ец-:*** *Варацец , Баравец ;*

***-ьј-:*** *Курганне;*

***-ав-:*** *Журжава;*

***-ын-:*** *Мечына ;*

***-ёк-:*** *Глеёк* (ад асновы глей - гліна); -

***ніц-:*** *Закладніцы* (ад асновы закладаць).

Прыставачна-суфіксальным спосабам утвораны мікратапонімы: *Перавессе* – прыстаўка *пера-*, суфікс *-ьј; Заброддзе, Замосце* – прыстаўка *за-*, суфікс *-ьј-*.

Спосабам складання ўтвораны мікратапонім *Смерцьдаліна* (мясц. *Смердаліна*).

Састаўныя мікратапонімы апелятыўнага паходжання ўяўляюць сабой словазлучэнне назвы аб’екта з прыназоўнікава-іменнай словаформай (спалучэнне прыназоўнікаў *ля, за, пад* і простага мікратапоніма): *Поле за Садом, за Валокаю, каля Цагельні, пад Ступішчамі.*

Мікратапонімы антрапанімічнага паходжання складаюць невялікую групу. У структурных адносінах яны падзяляюцца на простыя і састаўныя. Найменне *Васількове (Васільковае)* – поле, паша, сенажаць – паказвае на прыналежнасць аб’ектаў *Васільку*, паводле ўтварэння – субстантываваны прыналежны прыметнік з суфіксам *-ов-;* мікратапонім *Цітаў рог* – назва пашы, раней належала Ціту; *Дзюбароў рог, Салаўёў рог, Самойлава палянка* – указваюць на прыналежнасць аб’екта чалавеку па прозвішчы Дзюбар, Салавей, па імені Самойла, словазлучэнні складаюцца

МГПУ им. И.П.Шамякина

з прыналежных прыметнікаў, утвораных ад гэтых прозвішчаў пры дапамозе суфіксаў *-оў-*, *-ёў-*, *-ав-*, і назоўнікаў, назваў аб'ектаў.

Мікратапонімы антрапанімічнага паходжання ўтвораны наступнымі спосабамі:

бязафіксным спосабам ад прозвішчаў: *Вербавічы, Нядзеічы, Меляхі, Кулагі, Буглакі* – шляхам далучэння канчаткаў *-і(ы),* якія паказваюць на множнасць асоб, што пражываюць у той ці іншай частцы вёскі;

суфіксальным спосабам утвораны мікратапонім *Васількове (Васільковае)* ад імя Васілёк;

састаўныя мікратапонімы антрапанімічнага паходжання ўтвораны шляхам спалучэння прыналежных прыметнікаў з суфіксамі *-ін(-ын), -аў (-ав), -ёв-,* што паходзяць ад імёнаў , прозвішчаў людзей, якім належыць аб'ект, і найменне аб'екта: *Дзюбараў Рог, Салаўёў Рог, Самойлава палянка; Руманове (Сцепанкове, Бенцікове) болото* ўказваюць на размяшчэнне балота каля хаты жыхароў з мянушкамі Руман, Бенцік, з іменем Сцепанко;

мікратапонім *Дзедава гара* ўказвае на прыналежнасць аб'екта дзеду, складаецца з прыналежнага прыметніка, утворанага пры дапамозе суфікса *-ав-,* і назоўніка гара.

Такім чынам, прааналізаваны матэрыял дае падставу сцвярджаць, што шматлікімі з'яўляюцца мікратапанімічныя групы, што ўказваюць на асаблівасці рэльефу мясцовасці, на месца аб'екта (назвы-арыенціры), на наяўнасць аб'ектаў у мінулым, на вытворчую дзейнасць чалавека, на ўладальніка аб'екта. Гэтыя моўныя адзінкі – мікратапонімы – даюць уяўленне нам пра гісторыю вёскі, яе жыхароў. Паводле сцвярджэння вядомага даследчыка ў галіне тапанімікі, антрапанімікі А. Ф. Рогалева, "інфармацыя, атрыманая з імён уласных, можа быць больш карыснай, чым уласна гістарычная ці археалагічная інфармацыя" [4, с. 6].

Матэрыял сведчыць пра тое, што вёска Вербавічы – старажытнае паселішча (мікратапонімы ўказваюць на агульнаўсходнеславянскія карані іх паходжання), што асноўным заняткам людзей было земляробства, лясныя промыслы, паляванне, рыбалоўства, асваенне забалочаных участкаў, прырэчных нізін, з'яўляючыся сведчаннем таго, што жыхары вёскі Вербавічы, як і ўвесь беларускі народ, працалюбівыя і маюць працяглую гісторыю свайго існавання і развіцця.

**Літаратура**

1. Жучкевич, В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск: БГУ, 1974. – 448 с.
2. Иванова, А. А. Микротопонимия Мозырского Полесья / А. А. Иванова. – Мозырь: УО МГПУ, 2003. – 219 с.
3. Рогалев, А. Ф. Географические названия в калейдоскопе времен / А. Ф. Роголев. – Гомель: Барк, 2008. – 256 с.
4. Шур, В. В. З гісторыі ўласных імёнаў / В. В. Шур; пад рэд. П. У. Сцяцко. – Мінск: Выш. школа, 1993. – 156 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина